# «Вядомыя беларусы»

Шыкун Эвяліна,
вучаніца 8 класа
Азарыцкай сярэдняй школы
Калінкавіцкага раёна

# Іван


СЫН
ПАЛЕСКАЙ
ЗЯМЛІ
да 100-годдзя з дня нараджэння
народнага пісьменніка Беларусі
І.П. Мележа

## ФАКТ 1. БЫЎ ВЕЛЬМІ САРАМЛІВЫМ

У асяроддзі пісьменнікаў Іван Мележ лічыўся ідэальным суразмоўцам, таму што ён ўмеў слухаць.Мележ ніколі не перапыняў суразмоўцу нават тады, калі быў нязгодны. Зрабіць жа заўвагу пісьменнік не жадаў, а можа і саромеўся… Сам жа Іван Паўлавіч вёў гутаркі спакойна, разважліва, аргументавана, нібы ўзважваючы кожнае сваё слова, кожную думку. Таму ўсе, хто хоць раз сустракаўся на жыццёвым шляху Мележам, бязмерна даражылі яго словам.

# ФАКТ 2. ПЕРШЫ ТВОР НАПІСАЎ ЛЕВАЙ РУКОЙ

Упершыню пісаць творы Іван Мележ пачаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Першае ў сваім жыцці апавяданне пісьменнік быў вымушаны пісаць левай рукой, таму што знаходзіўся ў гэты час у шпіталі, у Тбілісі, дзе лячыўся ад ран. Апавяданне мае назву “Сустрэча” і публікавалася з паметкай “Каўказ, шпіталь, 1942 год”.



# Факт 3. Шыў сабе абутак і змайстраваў ровар

**Фраза “Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім” лічыцца штампам. Але да Мележа яна падыходзіць ідэальна. Як згадваў яго аднакласнік Пятро Чарняк, у дзяцінстве Іван хадзіў у школу ў пасталах, якія сам зрабіў з лазы (пасталы – мяккі сялянскі абутак, часта зроблены з цэлага кавалка скуры, які носіцца з анучамі і прывязваецца да ног аборамі). Тады як астатнім вучням да чацвёртага класа пасталы плялі бацькі. Але сапраўдную славу сярод аднагодак Мележу прынесла стварэнне драўлянага ровара. Колы былі зроблены з двух арэхавых абручоў, але са спіцамі і рамай.**



# Факт 4. «Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся»

У жыцці Мележа былі дзве гісторыі кахання. Яго першую дзяўчыну звалі Алеся. Яна нарадзілася ў той жа вёсцы Глінішчы, што і будучы пісьменнік. Юнакі пасябравалі падчас вучобы ў Алексіцкай сямігодцы. Далей Іван працягнуў вучобу ў дзесяцігодцы, што знаходзілася ў Хойніках, а Алеся паступіла ў педагагічны тэхнікум, скончыла яго і працавала настаўніцай. Каханых разлучыла вайна. Дзяўчына засталася на акупаванай тэрыторыі, а Мележ знаходзіўся на фронце. У 1942 годзе ён быў паранены і пасля лячэння ў тбіліскім шпіталі адпраўлены ў тыл. У горадзе Бугуруслан, што ў Арэнбургскай вобласці, ён пазнаёміўся з **Лідзіяй Пятровай**, маладзейшай за Івана Паўлавіча на два гады. У красавіку 1943-га яны, не сказаўшы нікому ні слова, пайшлі ў загс і распісаліся. Як згадвала пазней жонка пісьменніка, яны палічылі, што шлюб – іх асабістая справа і шумнага вяселля ім не трэба. Лідзія Пятрова-Мележ стала першым чытачом усіх твораў мужа





**Гео́ргій Аляксáндравіч Калду́н — беларускі спявак, тэле- і радыёвядучы, акцёр. Старэйшы брат спевака Дзмітрыя Калдуна.**

**Скончыў «з адзнакай» БДУ з кваліфікацыяй «Географ.Выкладык» Працаваў настаўнікам геаграфіі ў школе. Працаваў таксама ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Удзельнічаў у паказах адзення Сашы Варламава . Быў пераможцам конкурсу «Супермадэль Беларусі 2006».**



**Вядучы інтэлектуальных гульняў на тэлеканале «Беларусь 1»-- « Я знаю»**
**і да 2014 года «Адзін супраць усіх».**
**З 2015 года выконвае ролю Грэя ў мюзікле «Алые паруса».**